■ Спорт-тайм

НА ТАТАМІ — ГОРАЧА

У сталічным Палацы спорту адбыўся адкрыты чэмпіянат краіны па дзюдо

У беларускім дзюдо цяпер перазагрузка — змена пакаленняў. Замест былых лідараў на авансцэне з'яўляюцца маладыя ды амбіцыёзныя спартсмены, якім наканавана ў будучыні разам з трэнерамі змагацца за медалі на міжнароднай арэне і ўдзел на Алімпіядзе. На чарговым першынстве краіны, якое прымаў Мінск, якраз можна было ўбачыць моладзь — будучыню нашага дзюдо. Так, у многіх з іх яшчэ ўсё наперадзе, але імпэт, самааддача на татамі прымушае верыць у лепшае.

Цімафей ЕМЯЛЬЯНАЎ і яго ўзнагарода.

Гэтым разам узняўся на чэмпіёнскую прыступку п'едэстала і вядомы 30-гадовы беларускі дзюдаіст Андрэй Казусёнак. У паядынку з расіянінам Аляксандрам Данькавым прыйшлося добра папацець.

— Псіхалагічна было складана. Я не ведаў саперніка, з ім раней не сустракаўся, — кажа стомлены Андрэй, пераможца ў вагавай катэгорыі да 100 кг. — Тым больш у гэтым сезоне я не ўдзельнічаў у спаборніцтвах па дзюдо. Выступаў на чэмпіянаце Еўропы па самба, дзе заняў другое месца. Аднак цяпер знаходжуся на ростанях. Разважаю, ці спрабаваць адбірацца на Алімпійскія гульні ў дзюдо, ці рыхтавацца да першынства свету па самба. Між іншым, на Гульнях я ўжо быў, але вярнуўся з іх без медаля. Цяпер хочацца паспрабаваць ажыццявіць свае надзеі.

У адрозненне ад вопытнага Казусёнка, Цімафей Емяльянаў на сталічных матах заваяваў сваю дэбютную ўзнагароду ў дарослым спорце.

— Усе свае сустрэчы я завяршыў датэрмінова — іпонам, — усміхаецца шчаслівы Цімафей, які перамог у катэгорыі да 81 кг. — Спаборніцтвы мне вельмі спадабаліся. Яны адбываюцца раз на год і збіраюць усіх наймацнейшых дзюдаістаў рэспублікі. У фінале сапернічаў з Сяргеем Цярэшкам з Гродна. Памятаю, што мінулы раз я яму саступіў, але цяпер здолеў узяць рэванш.

За падзеямі першынства краіны ўважліва сачыў **Націк БАГІРАЎ, галоўны трэнер зборнай Беларусі па дзюдо.**

— На гэтых спаборніцтвах былі прадстаўлены ўсе рэгіёны рэспублікі: ад буйных гарадоў да маленечкіх пасёлкаў, — тлумачыць геаграфію турніру Націк Надзіравіч. — Арганізавана ўсё на вельмі добрым узроўні. Што казаць, Палац спорту — месца, дзе праводзяцца самыя маштабныя спаборніцтвы па дзюдо і самба ў нашай краіне. У адкрытым чэмпіянаце Беларусі ўдзельнічалі таксама і расіяне. Двое з іх прабіліся ў фінал. Што тычыцца нашых дзюдаістаў, у Мінску выступілі ўсе лідары беларускага дзюдо. Вырашылі толькі вызваліць ад удзелу Дзмітрыя Шэршня, які нядаўна перамог у міжнародным турніры «Мадрыд Оўпэн». Наогул, склад зборнай амаладзіўся. У першы дзень чэмпіянату мы ўшаноўвалі і праводзілі з вялікага спорту нашых заслужаных спартсменаў. Сярод іх Ігар Макараў, Сяргей Шундзікаў, Сяргей Новікаў, Аляксандр Шлык... Што тычыцца абноўленай зборнай, яна працуе не пакладаючы рук. Я бачу пэўны рост у майстэрстве спартсменаў. Спадзяёмся, да Алімпіяды падрыхтуем добрую каманду.

— Хто з дзюдаістаў здзівіў і парадаваў вас вынікамі на чэмпіянаце Беларусі?

— Сярод пераможцаў мой сын Арыф. Але, паверце, мы радуемся разам усім перамогам нашых дзюдаістаў. Усе, на каго мы разлічвалі, сталі чэмпіёнамі.

Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара.

НАРОДЖАНЫЯ 11 чэрвеня

Ім звычайна хапае рашучасці і адвагі, каб пераадолець любыя перашкоды, якія на іх шляху стварае ці то грамадства, ці то знешнія абставіны. Гэтыя людзі вылучаюцца сілай і воляй, якія дапамагаюць ім крочыць наперад. Гэта працаўнікі, яны цудоўна арыентуюцца ў галіне сваіх інтарэсаў, якім прысвячаюць усё жыццё і шмат робяць для таго, каб дасягнуць недасяжнага ў сваім майстэрстве. Іх рашучасць можа праявіцца ў любой сферы: бізнесе, спорце, кулінарыі, выхаванні. Яны карыстаюцца павагай і пашанай у сяброў і калег, нягледзячы на тое, што часам бываюць высакамернымі ў дачыненні да іх. Яны павінны выхоўваць у сабе пакорлівасць і паслухмянасць, якія змогуць абараніць іх ад празмернага праяўлення эгаізму.

Сканворд склала Ірына КНІГА.



ПРАВЕРЦЕ АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Спрадзіна. Ва. Аіда. Арба. Іра. Рагач. Орган. Зампт. Ордан. Абутак. Алушта. Ат. Лаз. Кот. Лак. Белагіка. Як. Кома. Іл. Ям. **Па вертыкалі:** Зжімо. Ла. Мак. Прыпорда. Апані. Ода. Гну. Во. Зіма. Шпем. Від. Наташа. Нар. База. Ка. Азу. Лі. Ната. Куранатка. Рабчык. Атам.

1	2	3	4	5	6	7	8	9

■ На свае вочы

У ГУРТ ІДУЦЬ АДНЫ... МУЖЫКІ

Кеды, макасіны, модныя туфлі або… шлёпанцы на босую нагу. Уітні Х'юстан, Дзіма Білан, гурты «Любэ», «Акіян Эльзы» і «Звяры», рускі рок і «Вы шуміце, бярозы». Гэта не карцінкі з вар'яцкага студэнцкага «капусніка», а ўрыўкі з кастынгу ў новы інтэрнацыянальны бойз-бэнд, які збірае пад свае сцягі вядомы прадзюсар Канстанцін Меладзэ. У мінулую суботу чарговы этап адбору «ВІА Гра з мужчынскім характарам» прайшоў у Мінску.

Гэта, дарэчы, не спужала прэтэндэнтаў з іншых гарадоў і нават краін — за некалькі гадзін знаходжання на кастынгу мы сустрэлі маладых людзей з Расіі, Украіны, Эстоніі і нават Ізраіля. Збольшага хлопцы былі настроены па-баявому, рашуча — лічаныя адзінкі прызнаваліся, што прыйшлі на адбор «проста так, паспрабаваць». Але аднаго імпэту было мала — патрабаваўся яшчэ як мінімум вялізны запас цярпення, каб дачакацца сваёй чаргі, і добрая падрыхтаванасць разам са стрэсаўстойлівасцю, каб не разгубіцца на праслухоўванні і за лічаныя хвіліны пераканаць строгіх рэдактараў і прадзюсараў праекта ў сваім патэнцыяле.

— Вы што падрыхтавалі? — спыталі ў чарговага ўдзельніка праекта «Хачу да Меладзэ».

— Песню.

— Адну? Ну, добра, спявайце,— уздыхае лінейны прадзюсар Вячаслаў Губернатар. Але прэтэндэнт блытаецца, забывае словы песні, практычна нічога не можа расказаць пра сябе і, здаецца, сам з палёгкай уздыхае, калі чуе вердыкт «трэба яшчэ пазаймацца вакалам».

— І што, такіх — большасць? — не стрымліваемся мы.

— Чаму ж,— разважліва адказвае Вячаслаў.— У Мінску ў параўнанні з іншымі гарадамі прыходзіць даволі шмат вакальна падрыхтаваных, «загартаваных» іншымі конкурсамі і тэлепраектамі хлопцаў. Напрыклад, нехта з вашай «Акадэміі талентаў», са «Спяваючых гарадоў», з адбораў на «Еўрабачанне». І хоць таксама хапае закрытых, сарамлівых людзей, у многіх ёсць неблагі шанц. Трапіліся і некалькі «самародкаў» — чалавек, скажам, бухгалтар або будаўнік, ніколі прафесійна вакалам не займаўся, але ў яго выдатны патэнцыял. Зрэшты, канчатковае рашэнне ўсё адно прымае Канстанцін. Наша ж задача — адабраць найбольш харызматычных, цікавых маладых людзей, з унутраным стрыжнем.

Заўважаем, што сярод кандыдатаў сустракаюцца і такія, хто відавочна ўжо даўно выйшаў з узросту бойз-бэндаў. Але і гэтым мужчынам ёсць што прапанаваць. Нехта прыносіць дыск з запісамі ўласных песень і просіць перадаць «асабіста Меладзэ», нехта проста прыходзіць самасцвердзіцца, даказаць, што пораху яшчэ хапае, і дэманструе шыкоўны голас…

Некаторыя кандыдаты прыйшлі на адбор, бы ў краму па хлеб: шлёпанцы на босыя ногі, шорты і безразмерныя футболкі; іншыя, наадварот, як быццам толькі што выйшлі з брэндавага буціка

Сустракаліся ў вялізнай чарзе і знаёмыя асобы. Фіналісты конкурсу «Містар Беларусь-2014» Ян Маерс і Канстанцін Бельскі, якія зусім нядаўна зладзілі супольны музычны гурт, разам удзельнічаюць у цяперашнім кастынгу. «Як гэта «навошта»? — каментуюць здзіўленне пабочных назіральнікаў.— Гэта ж такі шанц, які грэх упускаць. І нават калі не атрымаецца, будзе эфект — раскрутка». А саліст гурта «Litesound» Дзмітрый Каракін уразіў на праслухоўванні не толькі «паслужным спіскам» дасягненняў, але яшчэ і выкананнем знакамітага хіта Уітні Х'юстан «I will always love you», сарваўшы апладысменты. Як распавёў крыху пазней Дзмітрый, на адбор ён прыйшоў, бо «папрасіў вельмі блізкі чалавек». А яшчэ артысту проста цікава стала выйсці за межы звыклага рэпертуару і адчуць сябе зноў у ролі канкурсанта: «Усё адно цяпер запісам новага альбома збольшага займаецца мой брат, у яго студыя гуказапісу. Калі ж атрымаецца прайсці далей, думаю, крыж на існаванні нашага гурта ставіць не давядзецца. Але загадваць рана. Пакуль спадзяюся, што скарыстаю такую магчымасць — папрацаваць з Канстанцінам Меладзэ, якога я вельмі паважаю».

…Але збольшага мінскі адбор прыносіў адкрыцці. Вось невысокі, хударлявы Максім дэманструе такі запал і драйв, што ўсе міжволі пачынаюць прытанцоўваць. А вось Вадзім, які 11 гадоў займаўся танцамі, а потым вывучыўся на стыліста, пераконвае, што галоўнае яго прызванне — усё ж музыка. Наступны кандыдат на адным дыханні выдае тры песні — на ўкраінскай, беларускай і рускай мовах. І яны гучаць так пераканаўча, што вердыкт «Вы праходзіце далей» мы сустракаем дружным «Ура!».

Некаторыя кандыдаты прыйшлі на адбор, бы ў краму па хлеб: шлёпанцы на босыя ногі, шорты і безразмерныя футболкі; іншыя, наадварот, як быццам толькі што выйшлі з брэндавага буціка, а некаторыя як быццам збеглі з душнага офіса… Каму з некалькіх соцень хлопцаў пашанцуе, стане вядома ўжо даволі хутка: на працягу некалькіх тыдняў стваральнікі праекта мяркуюць вызначыцца і даць добра ўпадабаным выканаўцам на далейшы ўдзел у праекце.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Проста хацець да Меладзэ недастаткова — трэба яшчэ і добра спяваць.

▲ **Ян Маерс і Канстанцін Бельскі перад кабінетам прадзюсараў хвалююцца не менш чым перад фіналам конкурсу «Містар Беларусь».**

▶ **Саліст «Litesound» Дзмітрый Каракін на час праекта гатовы адысці ад спраў асабістага гурта.**



Фотаздымкі Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Даты | Падзеі | Людзі

978 год — на вялікакняжацкі кіеўскі прастол узышоў князь Уладзімір. У той час ніхто, і сам князь у тым ліку, не мог прадбачыць, што праз дзесяць гадоў ён зробіць хрысціянства дзяржаўнай рэлігіяй і ўвойдзе ў гісторыю з іменем Хрысціцель. Прыход да ўлады Уладзіміра, які абапіраўся на дружыну варагаў-язычнікаў, успрымаўся сучаснікамі як праява паганскай рэакцыі. І сапраўды, становішча хрысціян, ужо даволі шматлікіх да таго часу ў Кіеве, рэзка пагоршылася. Характэрна, што такая ж хваля пракацілася тады па ўсім скандынаўска-славянскім свеце: хрысціянства ўспрымалася большасцю народа як разбурэнне звыклых жыццёвых асноў. У прыватнасці, для людзей таго часу з'яўлялася дзіўным хрысціянскае патрабаванне мець толькі адну жонку. Сам князь Уладзімір меў шмат жонак і наложніц. Каля сваёй рэзідэнцыі ён загадаў паставіць статую бога Перуна з сярэбранай галавой. Тут прыносіліся чалавечыя ахвяры. Уладзімір паспяхова ваяваў. Пры ім улада Кіеўскай Русі распаўсюдзілася на далёкія ад сталіцы землі аж да Фінскага заліва і вярхоўяў Волгі.

1903 год — выдадзены першы выпуск трохтомнай навуковай працы філолага-славіста, заснавальніка беларускай філалогіі Яўхіма Карскага «Беларусы».

1937 год — у Маскве завяршыўся судовы працэс па так званай «ваенна-фашысцкай змове ў Чырвонай Арміі». Сярод абвінавачаных — вядомыя савецкія ваеначальнікі: Тухачэўскі, Якір, Убарэвіч, Прымакоў, Эйдэман. Усе яны былі асуджаны да пакарання смерцю і той жа ноччу расстраляны.

Было сказана

Уільям ШЭКСПІР, англійскі драматург:
«Любі ўсіх, давярай выбраным, не рабі зла нікому».

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества	**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным № 200/С-51889, общей площадью 2556 кв. м, назначение – здание специализированное для общественного питания, 1975 года постройки, стоимостью 2 279 775 000 руб. **Лот № 2.** Капитальное строение (четырехэтажная кирпичная пристройка к складу готовой продукции) с инвентарным № 200/С-51892, общей площадью 2084 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, 1972 года постройки, залоговой стоимостью 808 814 000 руб.
Собственник (владелец) имущества	Витебское ОАО «Классика индустрии моды»
Местонахождение (адрес) имущества	Витебская область, город Витебск, улица Максима Горького, дом 42
Место (адрес), дата и время проведения торгов	город Витебск, улица Максима Горького, дом 42 30 июня 2014 года в 15.00
Информация об обременениях имущества	Ипотека
Справочная информация об организаторе торгов	Главное управление юстиции Витебского облисполкома отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 318, www.vitebskjust.gov.by судебный исполнитель Ходунькин Сергей Сергеевич тел./факс (80212) 60 69 90, старший судебный исполнитель Бураков Игорь Вячеславович тел. (80212) 60 09 75, факс (80212) 60 31 76
Условия и порядок проведения торгов	**Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:** 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10% от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300002505, не позднее 15 ч. 00 м. 30.06.2014 г. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.

УНП 300002505

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 4.38	21.41	17.03
Віцебск	— 4.19	21.39	17.20
Магілёў	— 4.28	21.30	17.02
Гомель	— 4.34	21.18	16.44
Гродна	— 4.55	21.54	16.59
Брэст	— 5.05	21.45	16.40

Месяц

Поўня 13 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. Фядоссі, Івана, Лукі.
К. Адэлаіды, Настассі, Розы, Варнавы, Фелікса.

Фота Алесі ВАРАБЁВАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +19..+21°С	КІЕЎ +21..+23°С	РЫГА +16..+18°С
ВІЛЬНЮС +16..+18°С	МАСКВА +18..+20°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +18..+20°С

УСМІХНЕМСЯ

Урок у першым класе. Настаўніца:

— Восень, апала лістота, трава прыгнулася да зямлі. Каму, хлопцы, цяжэй за ўсё цяпер хавацца?

Вовачка:

— ДАІшнікам!

Камары сталі хітрэйшыя. Падлятаюць, садзяцца на ложак. А далей ідуць пешшу, каб іх не чуваць было...

У магазіне.

— Скажыце, калі ласка, гэтыя сасіскі свежыя?

— А ў вас дома зусім есці няма чаго?

Калі вы сварыцеся, а потым мірыцеся і ўжо праз дзень не памятаеце, чаму лаяліся, — гэта сапраўднае каханне. Хоць склероз выяўляецца гэтак жа.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.611. Індэкс 63850. Зак. № 2446.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 чэрвеня 2014 года.